Извещение о проведении 11 марта 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

Предмет торгов
«трансформаторная подстанция» общей площадью 42,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50676; «складское помещение» общей площадью 15,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50677; «производственно-бытовой корпус» общей площадью 118,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50678 (составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение, ворота, калитка, ворота); «устройство моечного отделения щебня» общей площадью 589,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-63932; асфальтосмесительная установка ДС-185 (инв. № 620); агрегат мокрой очистки щебня (инв. № 762); емкость 10 м³ (битум, инв. № 847); емкость 20 м³ (битум, инв. № 848); емкость 20 м³ (битум, инв. № 849); весы RV 3102 (инв. № 862); бункер приемный (инв. № 763); система видеонаблюдения (инв. № 0163); передвижное общежитие (инв. № 73); узел 1 подачи ж/с и щебня/конвейер 9 мп (инв. № 764); узел 2 подачи ж/с и щебня/конвейер 12 мп (инв. № 765); холодильник МИНСК 11 (инв. № 778); зеленые насаждения: липа № 22 (инв. № 918); тополь № 10 (инв. № 906); тополь №9 (инв. № 905); сосна № 14 (инв. № 910); сосна № 15 (инв. № 911); сосна № 17 (инв. № 913); береза № 1 (инв. № 897); береза № 11 (инв. № 907); береза № 12 (инв. № 908); береза № 13 (инв. № 909); береза № 16 (инв. 912); береза № 18 (инв. № 914); береза № 19 (инв. № 915); береза № 2 (инв. № 898); береза № 20 (инв. № 0916); береза № 21 (инв. № 917); береза № 3 (инв. № 899); береза № 4 (инв. № 0900); береза № 5 (инв. № 901); береза № 6 (инв. № 902); береза № 7 (инв. № 903); береза № 8 (инв. № 904)
Местонахождение: Витебская область, Витебский район, Новкинский с/с, д. Куковячино
Площадь земельного участка: 2,6274 га, кадастровый номер: 221287000010000001
Начальная цена: 208 219,68 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 20 000,00 бел. руб.
Обременение: аренда

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, т. (017) 507-61-83.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К.Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, т. (017) 327-05-62.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 11 марта 2020 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 25.02.2020 по 09.03.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»)

ОАО «Красный Октябрь» извещает акционеров о проведении 27 марта 2020 года в 11.00 очередного общего собрания по адресу:

г. Витебск, проспект ген. Людникова, 10/3

Повестка дня

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и перспективы развития на 2020 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2019 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2019 году.
4. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2019 год.
5. О распределении чистой прибыли Общества за 2019 год и о дивидендах за 2019 год.
6. Об утверждении направлений распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества в 2020 году.
7. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
8. О безвозмездной (спонсорской) помощи.
9. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Красный Октябрь».
10. Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Красный Октябрь».

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной Общества с 19 марта по 26 марта 2020 г. в рабочие дни (понедельник—пятница) с 8.30 до 17.00 и 27 марта 2020 г. по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2020 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

Справки по тел. 8-0212-52-55-70

Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь».
УНП 300003144

Стаўка на нашу даверлівасць і... наіўнасць

Сталі лазіць па электронных кішэнях

«Сёння крадзяжы перастаюць насіць так званы бытавы характар. Усё часцей яны здзяйсняюцца з выкарыстаннем рэквізітаў банкаўскіх плацежных картак або з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання», — заўважае **намеснік начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Беларусі Кірыл ВЯТКІН.**

Паводле звестак гэтага міністэрства, значна вырасла колькасць зарэгістраваных кіберзлачынстваў — з трохі больш чым 4,7 тысячы ў 2018 годзе да 10,5 тысячы летась. Колькасць незаконных дзеянняў, выяўленых падраздзяленнямі па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій, летась павялічылася ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Больш за дзве трацiны (8047) з зафіксаваных у мінулым годзе злачынстваў — крадзяжы з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі. Колькасць злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі ўзрасла ў цэлым па краіне ў 2,2 раза. Найбольш значны рост яе такіх фактаў назіраецца ў Віцебскай (з 75 да 317 выпадкаў) і Гродзенскай (з 89 да 315) абласцях. Абумоўлена гэта, на думку праваахоўнікаў, павелічэннем колькасці фактаў несанкцыянаванага доступу да камп'ютарнай інфармацыі — з 912 да 2185 выпадкаў.

Злачынства як гульня?

Летась супрацоўнікамі падраздзяленняў па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій устаноўлена больш за 1,8 тысячы асоб, вінаватых у здзяйсненні падобных злачынстваў. Да крымінальнай адказнасці прыцягнулі больш за 1,4 тысячы грамадзян, у тым ліку 1177 тых, хто не працуе і не вучыцца.

«Варта адзначыць такую негатыўную тэндэнцыю, як уцягванне ў супрацьпраўную дзейнасць маладога пакалення. Калі ў 2018 годзе прыцягнутых да крымінальнай адказнасці непаўналетніх было 35, то ў 2019-м колькасць іх павялічылася да 77», — падкрэсліў Кірыл Вяткін. Ён нагадаў, што прыцягнуць да адказнасці за крадзеж з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі можна з 14 гадоў. Прадстаўнік МУС расказаў, што нядаўна праваахоўнікі ідэнтыфікавалі кіберзлачынца, якім аказаўся 13-гадовы падлетак. Ён пазбег прыцягнення да крымінальнай адказнасці, але цяпер будзе пад пільнай увагай.

Прадстаўнік сілавога ведамства дадаў, што раней даводзілася сутыкацца з хакерамі, якія на добрым узроўні валодалі пэўнымі ведамі. Цяпер жа ўсё часцей у поле зроку міліцыі трапляюць людзі, якія купілі ў інтэрнэце шкоднае праграмнае забеспячэнне з інструкцыяй па яго ўжыванні і займаюцца выкраданнем грошай ці інфармацыі. Часта імі аказваюцца раней судзімыя людзі. Як лічаць праваахоўнікі, у першым паўгоддзі гэтага года тэндэнцыі па росце крымінагеннай абстаноўкі ў сферы высокіх тэхналогій захаваюцца. Гэтаму ў пэўнай ступені спрыяе далейшая актывізацыя ІТ-галіны і развіццё банкаўскіх інструментаў.

Расслабіліся, а дарма

Па словах прадстаўніка МУС, асноўнай прычынай падобных злачынстваў з'яўляецца бестурботнасць грамадзян і суб'ектаў гаспадарання. «Узровень камп'ютарнай адукаванасці людзей і выкананне патрабаванняў інфармацыйнай бяспекі арганізацый адстаюць ад хуткасці ўкаранення тэхналогій. Пры гэтым большасць з патэнцыйных ахвяр, на жаль, фармальна ставіцца да абароны бяспекі сваіх даных».

У сваю чаргу, Следчы камітэт чакае павелічэння колькасці кіберзлачынстваў і росту выкарыстання злачынцамі крыптавалюты, заявіў **намеснік начальніка ўпраўлення па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і інтэлектуальнай уласнасці галоўнага следчага ўпраўлення СК Дзмітрый ПЕТКА.**

Ён адзначыў, што крыптавалюта дае ўмоўную ананімнасць, дазваляе рэгістраваць неабмежаваную колькасць электронных кашалькоў без указання персанальных звестак. Гэтую інфармацыю складаней і знайсці. Але праваахоўнікі ўдасканальваюць сваю работу. «Па шэрагу крымінальных спраў абвінавачаныя добраахвотна рэалізавалі сваю крыптавалюту, каб кампенсаваць нанесеную імі шкоду», — паведамілі нам.

«Відавочна, што расследаваць такія злачынствы ў рамках адной дзяржавы немагчыма. Нават калі злачынец, знаходзячыся ў Беларусі, здзейсніў атаку на айчыннае прадпрыемства, ён усё роўна, як правіла, выкарыстоўвае замежныя IP-адрасы, нейкія інтэрнэт-сэрвісы, плацежныя сродкі», — растлумачыў спецыяліст СК. Ён дадаў, што ўзаемадзеянне з замежнымі ведамствамі ідзе па двух асноўных кірунках — пры расследаванні спраў і ў мэтах павышэння кваліфікацыі следчых і абмену вопытам. Найбольш цеснае супрацоўніцтва ў Следчага камітэта Беларусі з ЗША і Расіяй. «У ЗША зарэгістравана большасць кампаній з сусветным імем, якія аказваюць паслугі ў інтэрнэце. Іх выкарыстоўваюць у тым ліку і злачынцы. Расія з'яўляецца нашым найбліжэйшым суседам — нітачкі па многіх злачынствах вядуць у гэтую краіну. Маюцца на ўвазе найбольш сур'ёзныя серыйныя справы».

Прадаваў крадзеныя лагіны, зарабляў тысячы і... сеў

Але людзям, якім тэлефанавалі махляры, называлі іх персанальныя звесткі. Адкуль злачынцы іх бяруць? Спосабаў збору персанальнай інфармацыі шмат. Рэквізіты картак можна знайсці на спецыялізаваных ценявых сайтах у інтэрнэце. Пашпарт «свеціцца» ў медустанове, пры перасячэнні мяжы, пры афармленні растэрміновак. «Ваша банкаўская картка аналагічна «свеціцца» ўсюды, дзе вы ёю разлічваецеся, — удакладняе прадстаўнік СК. — Але ў нашай банкаўскай сістэме няма такіх дзірак, каб зліваліся рэквізіты ў даркнэт (патаемнае сеціва. — **«Зв.»**)».

Следчы камітэт прывёў у прыклад адну крымінальную справу. Так, жыхар Бабруйска на працягу некалькіх гадоў са свайго камп'ютара з выкарыстаннем мноства шкодных праграм здзяйсняў атакі на банкі, плацежныя сістэмы, інтэрнэт-крамы. Уліковыя запісы ён прадаваў праз свае інтэрнэт-крамы. Сам ён крадзяжоў не здзяйсняў, але на продажы чужой інфармацыі зарабіў каля 60 тысяч долараў.

Кліенты ў жыхара Бабруйска былі з усяго свету. Аферысты тысячамі набывалі чужыя рэквізіты доступу і распараджаліся ўліковымі запісамі для ашуканскіх аперацый ад імя іх законных уладальнікаў. Завалодаўшы крадзенымі лагінамі і паролямі, яны з 2016 да 2018 года скралі каля пяці мільёнаў долараў. Летась мужчына быў асуджаны і атрымаў рэальны тэрмін пазбаўлення волі.

Банк сам у стане заблакаваць любую транзакцыю

Леташні рост колькасці выпадкаў тэлефоннага махлярства (вішынгу) быў звязаны з бестурботнасцю людзей, лічыць **начальнік Галоўнага ўпраўлення плацежнай сістэмы і лічбавых тэхналогій Нацыянальнага банка Таццяна РУСКЕВІЧ.** Яна нагадала, што ні ў якім разе не варта нікому паведамляць свае персанальныя звесткі і звесткі, якія ўяўляюць банкаўскую таямніцу.

«Калі тэлефануюць ашуканцы і прадстаўляюцца супрацоўнікамі банка, там уключаецца пэўная музыка, чалавек шчыра пачынае гэтаму давяраць. Скажу шчыра, нават супрацоўнікі банкаў, якія з гэтым сутыкнуліся, кажуць, што ўсё пастаўлена ўзрушальна — спектакль выдатны, — дадала яна. — Банкам не трэба ведаць звестак, пра якія пытаюцца ашуканцы, — ні рэквізітаў карткі, ні дадатковых пароляў ці якіх-небудзь іншых даных. Банк сам у стане заблакаваць любую транзакцыю».

Не варта і заходзіць на спасылкі, якія дасылаюць па пошце ці ў месенджары. Каб скарыстацца паслугамі банка, трэба заходзіць непасрэдна на яго старонку або ў афіцыйную мабільную праграму. «Нікому не перадавайце ў рукі свой смартфон, з дапамогай яго можна зарэгістравацца ў сістэме электронных грошай і вельмі хутка вывесці сродкі», — адзначыла Таццяна Рускевіч. Яна дадала, што ўсе банкі цяпер разам з дасылаемым кодам пішуць паведамленне аб тым, што ён не павінен трапіць яшчэ да кагосьці акрамя кліента.

Начальнік аддзела рэагавання на камп'ютарныя пагрозы ўпраўлення абароны інфармацыі Нацбанка Сяргей МАЙСЕЙШЫН паведаміў, што зафіксаваныя летась інцыдэнты ўмоўна можна падзяліць на два тыпы — звязаныя са шкоднасным праграмным забеспячэннем і здзейсненыя з дапамогай метадаў сацыяльнай інжынерыі. Часта яны перасякаюцца. «Калі ў працэнтных суадносінах падзяліць гэтыя два тыпы, то колькасць інцыдэнтаў з выкарыстаннем метадаў сацыяльнай інжынерыі складае прыкладна 80 % ад агульнай колькасці, якую мы фіксуем».

Супрацоўнікі Нацбанка даюць некалькі парад, каб не папасціся на хітрыкі аферыста.

— Не паведамляйце невядомай асобе рэквізіты банкаўскай карткі.

— Не заходзьце па спасылках, якія прыходзяць на пошту, у месенджары.

— Беражыце свой мабільны тэлефон і нікому не перадавайце яго.

— Нікому не паведамляйце паролі, якія прыходзяць на тэлефон.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)